# Істотныя набыткі



У рамках Года роднай зямлі Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна працягвае дзейнасць па папаўненні гісторыка-дакументальнай спадчыны роднага краю. Вынікам плённага супрацоўніцтва з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі з'явіліся набыццё 43 рарытэтных кніг краязнаўчай тэматыкі — электронных копій выданняў XIX — пачатку XX стст., якія з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі для вывучэння гісторыі Магілёва і Магілёўскай губерні. Цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі аблічбавала для магілёўскіх чытачоў 30 краязнаўчых дакументаў, частку з якіх перадала бязвыплатна. Сярод набытых рарытэтаў — "Обзор Могилёвской губернии..." за 1881 г. і 1883 г. Гэта штогадовае даведачнае выданне аб адміністрацыйным і гаспадарчым жыцці губерні, якое змяшчае даведкі аб прамысловасці, гандлі, сельскай гаспадарцы, народнай асвеце за мінулы год. Усяго было выдадзена 29 "Обзоров...", 16 з якіх зараз захоўваюцца ў краязнаўчым фондзе абласной бібліятэкі. Карыстальнікі бібліятэкі знойдуць шмат цікавай інфармацыі па гісторыі краю ў наступных кнігах: "Городские поселения в Российской империи. Могилёвская губерния" (1863), Л. Галынец "К изучению в медико-топографическом и статистическом отношении губернского города Могилёва" (1887), "Список населённых мест Могилёвской губернии" (1910), "Отчёт Могилёвской Александринской общины сестёр милосердия Российского общества Красного Креста за 1897 год" (1897), "Столетие существования Могилёвской духовной семинарии: 1885 — 1885" (1885), "Список церковноприходских школ и школ грамоты Могилёвской епархии", "Описание Могилёвского музея" М. В. Фурсова, 6 выпускаў "Белорусского сборника" Еўдакіма Раманава і яго "Указатель к неофициальной части "Могилёвских губернских ведомостей" с 1839 по 1898 год" (1899), дзе друкаваліся краязнаўчыя матэрыялы па археалогіі, гісторыі, этнаграфіі, мовазнаўстве, народным тэатры. З некаторымі артыкуламі газеты можна пазнаёміцца ў кнізе Н. А. Озерава "Могилёвские губернские ведомости за 1838 — 1844 годы" (1905).

Знамянальна, што сёлетнім юбілейным для Магілёўскай мужчынскай гімназіі годам бібліятэка набыла два выданні пачатку XX стагоддзя, прысвечаныя старэйшай навучальнай установе Магілёўшчыны, якія дапамогуць глыбей вывучаць гісторыю развіцця народнай асветы на Магілёўшчыне.

**Тамара КАЛІНА,**
***загадчык аддзела Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна***